Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

Памылкі пры прыгатаванні кампосту

Усе ведаюць пра карысць кампосту — натуральнага арганічнага ўгнаення. Прыгатаваць яго па сілах кожнаму: тут не патрэбныя спецыяльныя ўменні ці прыстасаванні. Аднак нават у такой, здавалася б, нескладанай справе ёсць свае нюансы.

Памылка 1. Выкарыстанне толькі аднаго кантэйнера

Паспрабуйце размясціць на сваім участку мінімум два кантэйнеры для кампаставання. Для чаго гэта трэба? У той час, калі ў першым кантэйнеры спее карыснае натуральнае ўгнаенне, у другі вы падкладваеце новыя адкіды. Пакуль першая партыя будзе гатовае, другі кантэйнер якраз паспее напоўніцца.

Памылка 2. Няправільныя суадносіны зялёнай і карычневай мас

Любы кампост павінен складацца з зялёных і карычневых рэшткаў.

Зялёная маса для кампосту — гэта рэшткі раслін, скошаная трава, адходы садавіны і агародніны і іншыя кампаненты з вялікім утрыманнем азоту. Яны хутка награваюць кампост, спрыяюць росту і размнажэнню мікраарганізмаў, падтрымліваюць патрэбны для выспявання кампосту вуглярод-на-азотны баланс.

Карычневая маса для кампосту — гэта апалае лісце, салома, папера, кардон, здробненая кара, драўняная габлюшка, абрэзкі галін. Усе гэтыя высокавугляродзістыя матэрыялы ўтрымліваюць шмат клятчаткі. Іх функцыя — служыць ежай для бактэрый, якія раскладаюць арганіку, і пушыць кампост.

Нармальнае паспяванне кампосту магчымае толькі пры правільных суадносінах зялёных і карычневых кампанентаў. Пры занадта вялікай колькасці зялёных адходаў вы атрымаеце кашкападобную масу з непрыемным пахам, пры лішку карычневых адходаў кампост будзе раскладацца занадта павольна.

Звычайна на 1 частку зялёных кампанентаў бярэцца 2 часткі карычневых.

Памылка 3. Кампаставанне непрыдатных матэрыялаў

Не ўсякія адходы падыходзяць для кампаставання.

У кампост нельга класці:

- харчовыя адходы жывёльнага паходжання: мяса, рыбу, тлустую ежу і да т. п.;
- фекаліі жывёлін і людзей, у тым ліку выкарыстаныя падгузкі;
- расліны і пілавінне з драўніны, якія былі апрацаваныя хімічнымі прэпаратамі;
- рэшткі хворых раслін;
- пластмасу, шкло, сінтэтыку, вялікія кавалкі драўніны і г. д.;
- атрутныя расліны: наперстаўку, клешчавіну, ландыш, бульбоўнік і бацвінне таматаў.

Памылка 4. Лішак ці недахоп вады

Кампаставанне — раскладанне арганічных рэшткаў — адбываецца пад уздзеяннем высокай (55-60 °С) тэмпературы і паветра. Акрамя гэтых двух складнікаў, для нармальнага выспявання кампосту неабходная яшчэ наяўнасць некаторай колькасці вады. Аднак недахоп ці, наадварот, лішак вільгаці адмоўна адаб'юцца на хуткасці раскладання адходаў і якасці кампосту.

Каб вызначыць, ці ўсё ў парадку з кампостам, праверце яго: кампставая куча, якая «працуе» нармальна, — цёплая і пахне зямлёй.

Памылка 5. Адсутнасць паскаральніка

Для атрымання кампосту, акрамя вады, паветра і высокай тэмпературы, неабходныя мікраарганізмы, якія раскладаюць арганічныя рэшткі, ператвараючы іх у карыснае ўгнаенне. Чым больш у кампставай яме гэтых маленькіх працаўнікоў, тым хутчэй будзе адбывацца працэс кампаставання.

Адкуль яны бяруцца?

- Некаторыя мікраарганізмы трапляюць у кампставую кучу разам з раслінными рэшткамі, якія туды паклалі.
- Іх колькасць можна павялічыць самастойна, падклаўшы ў кучу трохі ўжо гатовага кампосту або садовай глебы.
- Яшчэ адзін спосаб — дадаць у кампост спецыяльныя прэпараты-паскаральнікі, якія спрыяюць хуткаму павелічэнню колькасці карысных мікраарганізмаў і павышаюць іх актыўнасць.

Памылка 6. Адсутнасць вентыляцыі

Наяўнасць кіслароду — адна з умоў хуткага раскладання арганічных рэшткаў. Калі доступ паветра абцяжараны (напрыклад унутры кампставай кучы), то працэс кампаставання запавольваецца.

Каб напоўніць паветрам усе часткі кампставай кучы, рэгулярна праводзьце яе аэрацыю. Зрабіць гэта можна рознымі спосабамі:

- змяшаць усе пласты кампставай кучы;
- праткнуць віламі кучу з усіх бакоў;
- зрабіць адтуліны пры дапамозе матыкі або доўгага кавалка арматуры.

Для паскарэння працэсу падрыхтоўкі кампосту ўсе раслінныя рэшткі перад закладкай у кучу здрабняюць і як мага часцей праводзяць аэрацыю кампосту. У гэтым выпадку мікробы, якія «адказваюць» за раскладанне арганікі, будуць працаваць хутчэй.

Каб вызначыць, ці выспеў кампост, вазьміце яго ў руку. Гатовы кампост мае цёмна-карычневы колер і зямлісты пах, ён рассыпісты. Калі ў ім знойдзеце кампаненты, што не да канца раскласіся, проста выдаліце іх і адпраўце ў тую кучу, якая ў дадзены момант спее, — яны раскладуцца разам з ёй.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.21	18.33	11.12
Віцебск —	7.12	18.22	11.10
Магілёў —	7.11	18.23	11.12
Гомель —	7.06	18.21	11.15
Гродна —	7.36	18.49	11.13
Брэст —	7.35	18.51	11.16

Месяц

Маладзік у 14.05. Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Іраіды, Андрэя, Івана, Інакенція, Пятра.*
К. *Ганны, Арнольда, Артура, Браніслава.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

6 КАСТРЫЧНІКА

У краіне

1745 год — нарадзіўся Францішак Смуглевіч, жывапісец і графік. Творчасць была звязаная з мастацкім жыццём Беларусі, Польшчы, Літвы, Расіі. Вучыўся жывапісу ў Рыме, выкладаў у Віленскім універсітэце. Выкладчыцкую дзейнасць сумяшчаў з творчай. З'яўляючыся прыхільнікам традыцый класіцызму, большасць сваіх твораў прысвяціў міфалагічным сюжэтам. Працаваў і ў жанры партрэта, пісаў карціны на гістарычныя тэмы, выконваў роспісы беларускіх цэркваў і касцёлаў. Афармляў кнігі, выканаў 150 малюнкаў.

1876 год — нарадзіўся (вёска Асташына, цяпер у Навагрудскім раёне) Ян Булгак, беларускі і польскі этнограф, фалькларыст, майстар мастацкай краязнаўчай фатаграфіі. У 1919—1939 гадах загадчык лабараторыі мастацкай фатаграфіі пры Віленскім універсітэце. Апублікаваў вялікую колькасць фатаграфій беларускіх пейзажаў, жылых і гаспадарчых пабудоў. Аўтар работ па беларускім фальклоры і краязнаўстве, эстэтыцы і тэхніцы фатаграфіі. Напісаў успаміны пра Ф. Рушчыца. Многія фатаграфіі Булгака захоўваюцца ў архівах і бібліятэках.

1908 год — нарадзіўся (в. Скорычы, цяпер у Карэліцкім раёне) Алесь Мілюць, беларускі паэт. Друкаваўся з 1928 года. Асноўныя матывы яго вершаў — пратэст супраць сацыяльнай і нацыянальнай варожасці, паэтызацыя маральнага ўдасканалення чалавека, апяванне прыгажосці роднага краю. Загінуў на фронце ва Усходняй Прусіі ў 1944 г.

1931 год — нарадзіўся (г. Горкі) Георгій Данілавіч Куляшоў, савецкі фізік-эксперыментатар, доктар фізіка-матэматычных навук. Аўтар навуковых прац па фізіцы электронных пучкоў і паскаральнікаў зараджаных часціц. Лаўрэат Ленінскай прэміі.

У свеце

1536 год — за ерась спалены на вогнішчы англійскі рэлігійны рэфарматар, перакладчык Бібліі на англійскую мову Уільям Ціндэйл.

1769 год — англійскі мараплавец Джэймс Кук высадзіўся ў Новай Зеландыі.

1922 год — пленум ЦК РКП (б) прыняў ленінскую пастанову аб форме аб'яднання савецкіх рэспублік.

1927 год — у Нью-Ёрку прайшла прэм'ера першага гукавога фільма («Спявак джаза»).

1940 год — нарадзіўся Юозас Будрайціс, акцёр тэатра і кіно («Ніхто не хацеў паміраць», «Шчыт і меч» і іншыя), народны артыст Літоўскай ССР.

1973 год — пачатак кастрычніцкай арабаізраільскай вайны (вайна Суднага дня).

Так гаварыў...

ВАЛЯНЦІНА АКОЛАВА:

«Душа — са споведзяў, а не з пракляццяў».

УСМІХНЕМСЯ

— Спадар, чаму ў вас маска на падбародку?!

— Спаўзла...

— Зараз жа надзеньце, як мае быць! А ў вас чаму няма маскі?

— Ды вось яна, у кішэні.

— Чаму ў кішэні?!

— Спаўзла...

Асабліва дакладна разумееш, што мы адны ў Сусвеце, калі позна ўначы захрас адзін у ліфце.

Лена задумалася, што, напэўна, неяк няправільна жыве, калі, раскрываючы падарункі на сваім дні нараджэнні, выявіла ўжо пяты штопар.

Я праграміст просты: калі задача простая, то мне сумна, а калі складаная — цяжка і страшна, што не атрымаецца зрабіць.

Пасля фразы жонкі «Так хочацца смажаных салёных клубніц» бацька семярых дзяцей страціў прытомнасць.



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2604. Нумар падпісаны ў 19.30 5 кастрычніка 2021 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12